«Вясна» — «экстрэмісцкае фармаванне».
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Хворую на сухоты жанчыну асудзілі на год калоніі: яна назвала Лукашэнку "казлом"

03.11.2022 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, грамадства, рэпрэсіі, дыфамацыя



Суд у Маладзечна. Ілюстрацыйнае фота: rh.by

3 лістапада 2022 года ў судзе Маладзечна і Маладзечанскага раёна суддзя Вадзім Петрусевіч прызнаў Людмілу Самак вінаватай паводле арт. 368 Крымінальнага кодэкса. Ён асудзіў яе да года пазбаўленні волі ў калоніі агульнага рэжыма.

Людміла Самак — жыхарка Крупскага раёна, яна хворая на сухоты, мае хранічны алкагалізм і некалькі судзімасцей. У дзень затрымання 19 верасня 2021 года яна ехала ў інфекцыйную бальніцу, каб лячыцца ад сухотаў. На чыгуначным вакзале ў Маладзечне жанчына сядзела на лаўцы і ўжывала алкаголь, калі да яе падышлі супрацоўнікі міліцыі. Пры іх яна

пачала крычаць, што Лукашэнка ***"казёл, плаціць сваім міліцыянтам, якія нічога не робяць"***. Таксама Самак ўжывала лаянку. Гэта запісалі прыборы відэафіксацыі, якімі карыстаюцца супрацоўнікі міліцыі.

Старшая памочніца пракурора **Юлія Жук** прасіла для жанчыны два гады пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыма. Аднак суддзя Вадзім Петрусевіч прызначыў удвая меншае пакаранне.

Юлія Жук працуе ў пракуратуры крыху больш за год, і за гэты час паспела прыняць удзел у абвінавачанні ў самых гучных палітычных працэсах у Маладзечне. Менавіта яна падтрымлівала дзяржабвінавачанне па справах за счэпку ў горадзе 9 жніўня, палітвязняў Дзмітрыя Скрэтуцкага, Аляксандра Казакевіча, Аляксея Кудзіна, шматдзетнага бацькі Андрэя Юркова, мужчыны з інваліднасцю Ігара Сідаровіча.



Пракурорка Юлія Жук

"Маладзечанская газета" у чэрвені 2022 года апублікавала тэкст, у якім распавядае пра Юлію Жук. Вядома, што яна атрымала вышэйшую эканамічную адукацыю, пасля працы ў сельскагаспадарчай арганізацыі Баранавіцкага раёна ў 2016 годзе прыйшла ў канцылярыю пракуратуры. У матэрыяле адзначана, што *"адзін месяц назіранняў за дзейнасцю калектыва запаліў у душы дзяўчыны нераадольнае жаданне стаць пракурорскім работнікам"*. Пасля гэтага Юлія Жук скончыла факультэт правазнаўства БДЭУ і з 2021 года стала працаваць на пасадзе памочніка пракурора.



Вясна. Правы чалавека ў ...
10 255 подписчики

Подписаться на Страницу







Палітвязня Аляксандра Арановіча будуць судзіць па новай крымінальнай справе. З ім няма сувязі амаль 5 месяцаў

Праваабарончая праграма "Вясна"

Дзмітрый Канеўскі: "Прэсінг у дачыненні да сябе ў калоніі я адчуваў штодня"

Як даведацца пра стан здароўя зняволенага: рэкамендацыі для сваякоў і адвакатаў



ГАЛОЎНАЕ

У магілёўскай калоніі № 15 памёр 22-гадовы палітзняволены Дзмітрый Шлетгаўэр



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Інстытут адвакатуры ў Беларусі дэградуе на працягу чатырох гадоў: факты, прычыны, ацэнкі (дапоўнена)

Штукатура асудзілі да трох гадоў калоніі за "адмаўленне генацыду беларускага народа"

"Магчымасць палітычных апанентаў Лукашэнкі ўдзельнічаць практычна выключаная": зарэгістраваныя ініцыятыўныя групы на выбарах*

Як і за што цяпер пераследуюць святароў? (дапоўнена)

Дваравыя чаты прызнаюць "экстрэмісцкімі фармаваннямі": хроніка пераследу 2-4 лістапада (дапоўнена)

У Брэсце ўраджэнца Украіны будуць судзіць за "здраду дзяржаве"

Мінчука асудзілі да прымусовага лячэння за "падрыхтоўку да ўдзелу ў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Верасень 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская Группа

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections
epde













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

